**18.** Якое слова прапушчана ў народным выслоўі?

*Ваду таўчы – … і будзе.*

**А)** смятана. **Б)** масла. **В)** вада. **Г)** каша. **Д)** кісель.

**19.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару **ў**?

*1) во..к; 2) а..сянка; 3) жале..ка; 4) по..ка.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

**20.** Якое(-ія) слова(-ы) з прапанаваных заканчваецца(-юцца) спалучэннем ***[шч]***?

*1) хвошч; 2) шчаняты; 3) дождж.*

**А)** усе дадзеныя словы. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2,3.

**21.** Колькі разоў сустракаецца апошні гук слова *пад* у назоўніках вершаванай загадкі Н. Гілевіча?

*Закаціўся пад плот,*
*Лёг у баразёнцы,*
*Паласаты жывот*
*Грэючы на сонцы.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**22.** Дадзены назвы птушак на беларускай мове:

*1) сітаўка; 2) крыжадзюб; 3) жаўна; 4) крумкач.*

Якая назва мае адпаведнік у рускай мове *клест*?

**А)** няма такой назвы. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**23.** Выберыце з прапанаваных слова(-ы) з ***[дз]***.

*1) дзверы; 2) дзяцінства; 3) дзынканне.*

**А)** 1. **Б)** 1, 2. **В)** 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

**24.** У беларускім алфавіце першая літара *а*. У рускім алфавіце таксама літара *а*. А якая першая літара ў лацінскім алфавіце?

**А)** v. **Б)** ž. **В)** f. **Г)** a. **Д)** g.

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 2. Тыраж 21400 экз. 2023 г.

# Конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2023»

*Чацвер, 16 лютага 2023 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі Якуба Коласа:

*Як той вандроўнік адзінокі,*
*Я марыў свой праклясці след*
*У нейкі край, у нейкі свет,*
*Такі чароўны і далёкі.*

Колькі слоў з літарай **ў** ужыта ў радках?

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**2.** Колькі назоўнікаў у скорагаворцы?

*Пад вываратнямі вавёрка віла вяроўкі вёртка.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**3.** Прачытайце загадку: *Я вада і па вадзе плаваю.*

Літары ў слове-адгадцы пераблыталіся. Вызначце правільны варыянт.

**А)** е, н, г, с. **Б)** ё, д, л. **В)** а, м, а, х, р. **Г)** а, з, т, е, в, р, ь. **Д)** й, і, е, н.

**4.** Мы з літарай ***з*** знаёмства маем, а таму словы з напісаннем літары ***з*** падбіраем:

*1) ..вязка;  2) ..мазка;  3) ..дань;  4) ..зянне.*

У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***з***?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**5.** Якія галосныя з прапанаваных неабходна ўставіць на месцы пропуску ў слове *д..м*, каб атрымаліся словы з пэўным лексічным значэннем?

*1) о;  2) ё;  3) ы;  4) і.*

**А)** усе прапанаваныя галосныя. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**6.** Якой часцінай мовы з'яўляецца выдзеленае слова ў народным выразе?

*На **гарыстым** полі не гавораць таямніц.*

**А)** назоўнікам. **Б)** прыметнікам. **В)** дзеясловам.
**Г)** займеннікам. **Д)** прыслоўем.

---

**7.** Базыль атрымаў заданне дапісаць сказы, падабраўшы патрэбныя назоўнікі. Дапамажыце хлопчыку справіцца з заданнем.

*1. У дуброве растуць … .  2. Ля дарогі ўкапалі … .*
*3. На маскарад надзенем … .  4. Будаўнікі надзенуць … .*

*а) каскі;  б) маскі;  в) слупкі;  г) дубкі.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-в, 2-г, 3-а, 4-б.
**Г)** 1-г, 2-в, 3-б, 4-а. **Д)** 1-б, 2-в, 3-а, 4-г.

---

**8.** У якіх словах з дадзеных аднолькавая колькасць гукаў і літар?

*1) ясень;  2) камень;  3) мільён;  4) шчаўе.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 4.

---

**9.** Калі замяніць першую літару ў слове *горка*, то атрымаецца слова са значэннем *'драпежны пушны звярок сямейства куніцавых з густой бліскучай поўсцю'*. На якую літару трэба замяніць літару ***г***?

**А)** няма такой літары. **Б)** на літару ***н***. **В)** на літару ***з***.
**Г)** на літару ***ж***. **Д)** на літару ***л***.

---

**10.** Вызначце з прапанаваных слова(-ы), якое(-ія) нельга падзяліць для пераносу.

*1) яліна;  2) арыя;  3) мільёны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такога слова. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**11.** Прачытайце ўважліва сказ:

*Будзь чулы, уважлівы да ўсіх людзей усюды і заўсёды!*

Які гэты сказ па інтанацыі?

**А)** апавядальны. **Б)** пытальны. **В)** клічны.
**Г)** пабуджальны. **Д)** няклічны.

---

**12.** Васілёк сустрэўся з сябрамі і расказаў: *"Марожанае мы лізалі, а ў ім разынкі ляжалі. Мая малодшая сястра іх старанна жавала і ад стомы ўсё зявала."*

Які адпаведнік мае ў рускай мове назоўнік *разынкі*?

**А)** слива. **Б)** изюм. **В)** курага. **Г)** инжир. **Д)** финики.

---

**13.** Прачытайце народную заклічку:

*Агурочак, агурочак,*
*Не хадзі на той платочак:*
*Там мышка жыве,*
*Табе хвосцік адгрызе.*

Якім членам сказа з'яўляецца слова *агурочак*?

**А)** не з'яўляецца членам сказа. **Б)** дзейнікам. **В)** выказнікам.
**Г)** дапаўненнем. **Д)** азначэннем.

---

**14.** Выберыце з дадзеных прыкладаў тыя, у якіх патрэбна напісаць на месцы пропуску ў прыметніках канчатак ***-ы***(***-і***).

*1) сонечн.. надвор'е;  2) доўг.. цень;  3) металічн.. цвік.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма такіх прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**15.** Прачытайце ўважліва сказ:

*Ляжаць ля талеркі відэлец, нож, лыжкі.*

Колькі назоўнікаў у форме множнага ліку ў ім ужыта?

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**16.** У якіх словах з прапанаваных толькі адзін ***[а]***?

*1) баян;  2) мякіш;  3) яма;  4) агонь.*

**А)** у 1, 2. **Б)** у 1, 3. **В)** у 2, 3. **Г)** у 2, 4. **Д)** у 3, 4.

---

**17.** Вызначце на дадзеных малюнках тыя выявы, у пачатку назваў якіх ёсць ***[г]***.

*1)*  *2)*  *3)*  *4)* 

**А)** няма такіх малюнкаў. **Б)** 1, 2. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 3, 4. **Д)** 3, 4.